**УДК 821.162.1.09**

**Хмяльніцкі Мікалай Мікалаевіч**
доктар філалагічных навук, дацэнт,
загадчык кафедры кітайскай філалогіі
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
г. Мінск, Беларусь

**Mikalai Khmialnitski**
Habilitated Doctor of philology
Associate Professor
Head of Chinese Philology Department
Belarusian State University
Minsk, Belarus
KhmelnickiNN@bsu.by

# ІМАГАЛАГІЧНЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ С. П. МУСІЕНКА: БЕЛАРУСКА-ПОЛЬСКІ ВЕКТАР

# IMAGOLOGICAL RESEARCH OF S. P. MUSIENKA: BELARUSIAN-POLISH VECTOR

У артыкуле разглядаюцца навуковыя здабыткі С. П. Мусіенка як даследчыка беларуска-польскіх літаратурных сувязей праз прызму імагалогіі. Ахарактарызаваны асноўныя аб’екты літаратуразнаўчай увагі вучонага: тэарэтычна-метадалагічныя прынцыпы імагалогіі як навукі, жыццё і творчасць А. Міцкевіча, Э. Ажэшка, Г. Сянкевіча, С. Выспянскага, З. Налкоўскай, А. Карпюка і інш., феномен беларуска-польскага культурнага памежжа, беларуская/польская рэцэпцыя твораў пісьменнікаў Польшчы і Беларусі. Выяўлены асноўныя вектары імагалагічных даследаванняў С. П. Мусіенка, прысвечаных характарыстыцы форм і ўзроўняў іншанацыянальнай прысутнасці ў творах польскіх аўтараў XIX–XX стагоддзяў.

Ключавыя словы: *імагалогія*; *кампаратывістыка*; *літаратурныя сувязі*; *рэцэпцыя*; *польская літаратура*; *беларуская літаратура*; *традыцыя*; *стэрэатып*; *дыскурс*; *памежжа*.

The article examines the scientific achievements of S. P. Musienka as a researcher of Belarusian-Polish literary relations through the prism of imagology. The paper characterises the main objects of the scholar’s literary attention, including theoretical-methodological principles of imagology as a science, the life and work of A. Mickiewicz, E. Orzeszkowa, H. Sienkiewicz, S. Wyspiański, Z. Nałkowska, A. Karpiuk, etc., the phenomenon of Belarusian-Polish cultural borderland, Belarusian and Polish reception of the works of writers from Poland and Belarus. The main vectors of S. P. Musienka’s imagological research dedicated to the characterisation of the forms and levels of foreign presence in the works of the Polish authors of the 19th–20th centuries are revealed in the article.

Key words: *imagology*; *comparative studies*; *literary connections*; *reception*; *Polish literature*; *Belarusian literature*; *tradition*; *stereotype*; *discourse*; *borderland*.

Дыялог літаратур у сацыякультурным арэале славян – гэта гістарычная неабходнасць і аб’ектыўная заканамернасць. Дадзены працэс абумоўлены разнастайнымі фактарамі: гістарычнай рэтраспектывай і перспектывай, моўнай агульнасцю, геаграфічнай блізкасцю, міждзяржаўнымі адносінамі і інш. У выніку такога ўзаемадзеяння ўтварылася адмысловая прастора памежжа, сутнасныя характарыстыкі якой знайшлі ўвасабленне ў мастацкай творчасці розных аўтараў славянскіх краін ад Сярэднявечча да Новага і Навейшага ча-

соў. Гэты пласт прыгожага пісьменства стваралі ў першую чаргу пісьменнікі, народжаныя на памежных тэрыторыях, якія апрыёры былі запраграмаваны на культурную і літаратурную трансгрэсію.

Падобныя дыялагічныя сустрэчы беларускага субстрату (у самым шырокім сэнсе гэтага слова) і пісьменніцкай свядомасці ў зоне сацыякультурнага сумежжа беларусаў і палякаў мелі сваю спецыфіку ў розныя літаратурныя эпохі. У выніку гэтага працэсу, як слушна адзначыў У. Казбярук, "польская літаратура да пачатку XX стагоддзя стварыла свае традыцыі ў адлюстраванні жыцця беларускага народа, прытым разнародныя. Такія паэты і празаікі, як А. Міцкевіч, Ю. І. Крашэўскі, У. Сыракомля, Э. Ажэшка, М. Канапніцкая і многія іншыя майстры слова, у адпаведнасці са сваім уласным бачаннем заканамернасцей жыцця і грамадскіх працэсаў, уласнымі адносінамі да беларускага народа і да сацыяльных праблем, у адпаведнасці з творчымі схільнасцямі, асаблівасцямі пісьменніцкага таленту, кожны па-свойму паказвалі гэта жыццё" [1, с. 42].

Важную ролю ў сучасным навуковым дыскурсе адыгрывае літаратуразнаўчая імагалогія, якая дапамагае спасціжэнню (адкрыццю) свайго з дапамогай чужога субстрату ў творах розных жанраў. Імагалагічны вектар вывучэння кантэксту і самабытнасці славянскага сацыякультурнага сумежжа ў апошнія дзесяцігоддзі даў плённыя вынікі як у тэарэтычным, так і ў практычным аспектах: з'явіўся шэраг прац, прысвечаных складаным пытанням узаемадзеяння літаратур суседніх з Беларуссю краін, у першую чаргу даследаванню жыцця і творчай спадчыны пісьменнікаў – ураджэнцаў беларуска-польскага сумежжа розных перыядаў [1; 2; 3; 4; 5; 6; 7; 8; 9; 10].

Заснавальнікам і яскравым прадстаўніком імагалагічнага падыходу ў літаратуразнаўстве на матэрыяле руска-польскіх узаемадачыненняў стаў В. А. Хораў, працы якога з'яўляюцца грунтоўным навуковым падмуркам для вывучэння польска-іншаславянскіх літаратурных сувязей [11; 12; 13; 14; 15]. *Імагалогія*, паводле вызначэння расійскага вучонага, "ставіць сваёй задачай выявіць сапраўдныя і ілжывыя ўяўленні аб жыцці іншых народаў, стэрэатыпы і прадузятыя ўяўленні, якія існуюць у грамадскай свядомасці, іх паходжанне і развіццё, іх грамадскую ролю і эстэтычную функцыю ў мастацкім тэксце" [12, с. 22]. Такім чынам, імагалогія рэпрэзентуе новы тып сістэмна-цэласнага аналізу і твораў розных жанраў, і мастацкай спадчыны пісьменнікаў, і канкрэтнай літаратуры, якая ўспрымаецца ў святле як нацыянальнай, так і іншанацыянальнай традыцыі, аўтарскай свядомасці, сістэмы стэрэатыпаў, моўнай карціны свету таго ці іншага народа.

Важнасць і значнасць імагалагічнага падыходу ў айчынным навуковым дыскурсе засведчыла Святлана Піліпаўна Мусіенка, якая ў сваіх працах даказала яго неабходнасць і плённасць менавіта пры даследаванні беларуска-польскіх літаратурна-культурных сувязей: "Для беларускай навукі вялікую актуальнасць набывае не толькі пытанне вывучэння беларускіх нацыянальных стэрэатыпаў, якія нарадзіліся і выраслі ў межах беларускай культуры, увабралі ў сябе яе традыцыі, каштоўнасці і прыярытэты, але і пытанне аб

стварэнні ахоўнага асяроддзя для далейшага развіцця гэтых стэрэатыпаў, недапушчэння ўплываў, якія могуць уздзейнічаць на гэты працэс, скажаючы, у рэшце рэшт, нацыянальную карціну свету. Відавочна, што беларускі стэрэатып паляка, які быў і застаецца аб’ектам трансфармацыйных уплываў, мае ў гэтым вялікую патрэбу” [16, с. 184].

Доктар філалагічных навук, прафесар С. П. Мусіенка – аўтар больш чым 200 навуковых работ, апублікаваных у Беларусі, Расіі, Польшчы і многіх краінах Еўропы, рэдактар і сааўтар шматлікіх літаратуразнаўчых выданняў, зборнікаў навуковых прац, матэрыялаў канферэнцый і круглых сталоў. У грунтоўных публікацыях вучонага рэканструюецца сацыякультурны кантэкст розных перыядаў беларуска-польскіх літаратурных узаемадачыненняў, аналізуецца творчасць пісьменнікаў дзвюх краін у парадыгме “беларускасць – польскасць”, “нацыянальнае – універсальнае”, а таксама даследуюцца этнічныя стэрэатыпы і іх адлюстраванне ў суседніх літаратурах, праблемы рэцэпцыі, функцыянавання ключавых беларускіх рэалій, вобразаў і матываў у творах прадстаўнікоў літаратуры Польшчы [17; 18; 19; 20; 21; 22; 23; 24; 25]. Мэтай дадзенага артыкула з’яўляецца цэласны, заснаваны на прынцыпе гістарызму разгляд славеснага мастацтва беларускага і польскага народаў, які здзяйсняецца С. П. Мусіенка праз прызму імагалогіі ў яго эвалюцыі, ва ўзаемадзеянні і ўзаемапранікненні. Гэта дазваляе прасачыць працэсы станаўлення і развіцця сацыякультурнага феномена сумежжа, вызначыць і канкрэтызаваць ролю беларускай праблематыкі ў творах польскіх аўтараў розных стагоддзяў.

Імагалагічны падыход, які творча і шматаспектна выкарыстаны ў працах С. П. Мусіенка, актуалізуе міждысцыплінарны вектар даследаванняў, дэманструе плённыя вынікі пры разглядзе духоўна-культурнай спадчыны суседніх славянскіх народаў праз прызму нацыянальнай свядомасці, літаратурных традыцый. З дапамогай такіх паняццяў, як *мадэль мыслення, імідж* (вобраз), *стэрэатып, этнастэрэатыпы, рэцэпцыя, тыпалогія* і інш., даследчык выбудоўвае цэласную сістэму імагалагічных пошукаў і характарыстык [9; 16; 26; 27; 28]. Так, у адной са сваіх прац вучоны слушна адзначае: “Высвятленне і стараннае вывучэнне гістарычных каранёў беларускага стэрэатыпа паляка, умоў і фактараў яго генезісу, зразумела, у большай ступені неабходна самім беларусам для развіцця ўласнай нацыянальнай самасвядомасці, фарміравання гістарычнай памяці, правільнай арыентацыі ў сучасным свеце. А сам стэрэатып у гэтай сувязі можна назваць адным з інструментаў працэсу «канструявання» беларускай нацыі, які і сёння ўсё яшчэ ідзе. Веданне акалічнасцей яго генезісу мае таксама практычную важнасць, бо дазволіць больш выразна бачыць сутнасць праблем, якія існавалі і існуюць у беларуска-польскіх адносінах” [16, с. 179].

Літаратуразнаўца неаднаразова падкрэслівала актуальнасць і пленнасць імагалагічнага напрамку даследаванняў, надаўшы яму ў сваіх публікацыях шматстайнае практычнае ўвасабленне. Яна здзейсніла сапраўдны навукова-асветніцкі подзвіг, адкрыўшы ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя

Янкі Купалы першы ў гісторыі дзвюх краін музей вядомай польскай пісьменніцы Зоф'і Налкоўскай, жыццё і творчасць якой былі пэўны час звязаны з Гродна. Росшукі дакументаў, размовы са сведкамі, сустрэчы са спецыялістамі, тэксталагічныя штудыі, праца ў архівах далі свой плён: з'явілася наватарскае выданне "Творчасць Зоф'і Налкоўскай" (на рускай мове, 1989) – першае манаграфічнае даследаванне ў СССР пра знакамітую польскую пісьменніцу, у якім былі выкарыстаны невядомыя раней архіўныя матэрыялы, паказана значнасць Гродна ў творчай біяграфіі З. Налкоўскай. Падзеяй у навуковым жыцці стала выданне манаграфіі С. П. Мусіенка "Рэалістычны раман у польскай літаратуры міжваеннага дваццацігоддзя" (2003), якая з'яўляецца грунтоўным даследаваннем жанравай спецыфікі і ідэйна-мастацкай разнастайнасці польскага рамана акрэсленага перыяду з выхадамі ў беларускі кантэкст. Не менш знакавай падзеяй стаў выхад кнігі "Ідэйна-мастацкія пошукі ў польскай прозе 1950–60-х гг." (2015), у якой сістэмна прадстаўлены асноўныя тэндэнцыі яе развіцця, творчыя індывідуальнасці розных аўтараў азначанага перыяду з улікам грамадска-палітычнай сітуацыі і сацыякультурнай дынамікі.

Вектар імагалагічных пошукаў С. П. Мусіенка дастаткова шырокі: навуковец актыўна даследуе беларуска-польскія літаратурныя ўзаемасувязі, фенаменалогію сумежжа, віды і ўзроўні рэцэпцыі, механізмы стварэння Іншага ў нацыянальным культурным кантынууме. Аб'екты асаблівай увагі і любові С. П. Мусіенка як прадстаўніка беларускай школы літаратуразнаўчай імагалогіі – жыццё і творчасць Адама Міцкевіча і Элізы Ажэшка. Іх спадчына не раз станавілася эпіцэнтрам шматлікіх міжнародных і рэспубліканскіх навуковых канферэнцый, круглых сталоў, семінараў, якія праводзіліся ў Гродна. Гэтым вялікім пісьменнікам – ураджэнцам беларускай зямлі С. П. Мусіенка прысвяціла дзесяткі грунтоўных публікацый [6; 29; 30; 31; 32; 33]. Значную ўвагу даследчык звяртала ў сваіх працах на ролю беларускіх фактараў (атачэнне, мова, прырода, фальклор, звычаі і традыцыі), на фармі-раванне творчай індывідуальнасці Адама Міцкевіча, праблему "малой радзі-мы" (ад факта да настальгіі), формы прысутнасці і функцыянавання бела-рускіх рэалій у яго творах ("Балады і рамансы", "Гражына", "Дзяды" і інш.).

Беларуска-польскае памежжа ў літаратурнай спадчыне Элізы Ажэшка – яшчэ адзін вектар зацікаўленасці С. П. Мусіенка. Гэтай пісьменніцы Святлана Піліпіўна прысвяціла шмат артыкулаў, у якіх даследавала гродзенскі складнік, міфы, звязаныя з жыццём і творчасцю "малодшай сястры Міцкевіча" (С. Бжазоўскі). Беларускі даследчык шматаспектна разгледзела такія пытанні, як беларускае сялянства ў творчым успрыманні Э. Ажэшка, стэрэатыпы беларуса і беларускай вёскі ў польскай літаратуры XIX ст., нацыянальна-этнічныя рысы беларусаў праз прызму сацыяльнай несправядлівасці, беларускія традыцыі, абрады, фальклор у творах пісьменніцы, роля прыроды наднё-

манскага краю, мастацкі вобраз жыцця народаў рэгіёна, легенды і гістарычная праўда ў асвятленні паўстання 1863 года.

Імагалагічныя даследаванні – ядро дзейнасці “Міжнароднага інстытута Адама Міцкевіча”, створанага прафесарам С. П. Мусіенка ў 2009 г. на базе Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гэтая інстытуцыя аб’яднала навукова-дыдактычныя намаганні беларускіх, польскіх і расійскіх даследчыкаў найперш у галіне імагалогіі як гуманітарнай навукі, распрацаванай вучоным на аснове канцэпцыі і тэарэтыка-метадалагічных палажэнняў прафесара В. А. Хорава ў дачыненні да праблемы ўзаемнага ўспрымання беларусамі палякаў і палякамі – беларусаў. Шматлікія публікацыі беларускага вучонага, выкананыя ў імагалагічным рэчышчы, адкрываюць новыя ракурсы асэнсавання нібыта вядомых мастацкіх твораў польскіх пісьменнікаў розных перыядаў, актуалізуюць міждысцыплінарны вектар даследаванняў, а таксама скіроўваюць навуковую думку да вывучэння духоўнай спадчыны іншага народа праз прызму ўласнай нацыянальнай свядомасці, рэканструкцыі адпаведнай парадыгмы ўзаемаўспрымання суседніх славянскіх народаў, зафіксаванай у помніках культуры, літаратуры і мастацтва.

Тэарэтычныя палажэнні, сфармуляваныя ў працах В. А. Хорава і С. П. Мусіенка, атрымалі ў свой час і вучэбна-практычнае ўвасабленне: Святлана Піліпаўна з’явілася аўтарам двух арыгінальных спецыяльных курсаў для студэнтаў, у якіх на багатым матэрыяле быў рэалізаваны імагалагічны падыход: “Помнікі культуры Гродна ў творчасці Зоф’і Налкоўскай” [34] і “Узаемадзеянне і ўзаемаўплыў моў і літаратур у сучасным мастацка-літаратурным працэсе (імагалагічны аспект)” [27], якія карысталіся нязменнай цікавасцю сярод студэнтаў і калег. Тут актуальныя праблемы імагалогіі набылі канкрэтнае напаўненне і арыгінальную інтэрпрэтацыю, што садзейнічае павышэнню літаратуразнаўчай кампетэнцыі філолагаў-паланістаў, паглыбленню іх краязнаўчага досведу. Напрыклад, у спецкурсе “Узаемадзеянне і ўзаемаўплыў моў і літаратур у сучасным мастацка-літаратурным працэсе (імагалагічны аспект)” разглядаліся такія тэмы і праблемы, як імагалогія ў эпоху глабалізацыі, агульначалавечыя і нацыянальныя фактары ў развіцці сусветнай і нацыянальных літаратур і мастацтваў, адметнасць нацыянальнага вобраза (imago) і яго істотныя прыкметы, беларус ва ўмовах этнакультурнага памежжа, беларус як этнакультурны тып у польскай літаратуры, эмацыянальна-суб’ектыўнае ўвасабленне беларуса ў творчасці польскіх пісьменнікаў, уплыў этнакультурных і сацыяльна-псіхалагічных рысаў беларуса на польскую літаратуру, беларус як герой польскай літаратуры ў яе гісторыі і сучасным развіцці (Міцкевіч, Ажэшка, Налкоўская, Канвіцкі) і інш. [27]. Важна падкрэсліць, што кожная з прапанаваных тэм можа стаць прадметам асобнага міждысцыплінарнага даследавання на матэрыяле беларускай і польскай літаратур.

Літаратуразнаўца неаднойчы адзначала актуальнасць імагалогіі як навукі, яе запатрабаванасць і практычнае значэнне: “Калі весці размову аб сучаснасці XX і XXI стагоддзяў, то іх характэрнай рысай з’яўляецца немаг-

чымасць захавання замкнёнасці з’яў. Вынаходніцтвы і дасягненні асобных людзей і народаў становяцца дасягненнямі ўсяго чалавецтва. Таму і стала актуальнай патрэба вывучэння «іншага» ці «чужога», якія з’яўляюцца прадметам імагалогіі – навукі, вельмі неабходнай сучаснаму жыццю, яго ідэалогіі, культуры, гісторыі чалавека і чалавецтва” [27, с. 180].

Імагалагічны падыход, прадэманстраваны ў працах С. П. Мусіенка, дазваляе выявіць ролю і значэнне беларускіх рэалій, вобразаў і матываў у іх цэласным узаемадзеянні ў польскамоўным тэксце, што ў значнай ступені абумовіла спецыфіку рэгіянальнага развіцця мастацтва слова. Многія творы літаратуры Польшчы, як слушна даводзіць і абгрунтоўвае беларускі даследчык, з’яўляюцца алегорыяй нацыянальнага быцця народаў памежнага рэгіёна, бо ў іх выяўлены прыродна-ландшафтныя асаблівасці кантактнай зоны, зафіксавана канцэптуальнае адзінства ў асэнсаванні сакральнага сэнсу малой і гістарычнай радзімы, архетыпу дома і матыву мяжы.

Разгледжаныя працы і высновы С. П. Мусіенка даказваюць, што імагалогія – актуальны і запатрабаваны напрамак айчыннага літаратуразнаўства, скіраваны на выяўленне спецыфікі нацыянальных вобразаў Беларусі і Польшчы ва ўзаемным успрыманні і асэнсаванні, вызначэнне і апісанне феномена польска-беларускага літаратурнага сумежжа. Пры імагалагічным падыходзе беларускасць, якая атрымала ідэйна-мастацкае ўвасабленне фактычна ва ўсіх родава-жанравых сістэмах польскай літаратуры і вызначыла праблемна-тэматычны спектр твораў, разглядаецца шматаспектна і канцэптуальна.

Такім чынам, тэарэтыка-метадалагічныя палажэнні імагалогіі пры даследаванні беларуска-польскага літаратурнага ўзаемадзеяння, бліскуча прымененыя ў працах С. П. Мусіенка, рэпрэзентуюць міждысцыплінарны вектар даследаванняў, з’яўляюцца грунтоўным падмуркам для будучых штудый па выяўленні прысутнасці і функцыянавання беларускай праблематыкі не толькі ў прыгожым пісьменстве Польшчы, але і ў іншых славянскіх літаратурах.

ЛІТАРАТУРА

1. *Казбярук, У.* Ступені росту. Беларуская літаратура канца XIX – пачатку XX ст. і традыцыі польскіх пісьменнікаў / У. Казбярук. – Мінск : Навука і тэхніка, 1974. – 189 с.
2. *Бахановіч, Н. Л.* Абліччы Іншага ў шматмоўнай літаратуры Беларусі XIX стагоддзя : манаграфія / Н. Л. Бахановіч ; навук. рэд. І. М. Запрудскі ; Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ. – Мінск : Беларуская навука, 2022. – 305 с.
3. Беларуска-еўрапейскія літаратурныя ўзаемасувязі і імагалогія / Т. П. Барысюк [і інш.] ; навук. рэд. У. В. Гніламёдаў, М. У. Мікуліч. – Мінск : Беларуская навука, 2022. – 492 с.
4. Літаратурныя сувязі: праблемы імагалогіі : Хораўскія чытанні / рэдкал.: С. Ф. Мусіенка [і інш.]. – Мінск : РІВШ, 2016. – 217 с.
5. *Лойка, А.* Роздум пра польскую паэзію XX стагоддзя і яе дачыненні да Беларусі / А. Лойка // Шлях да ўзаемнасці : навук. зб. па матэрыялах Міжнар.

канф. і чытанняў / Каф. бел. філал. Варш. ун-та [і інш.]. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2000. – С. 7–22.
6. Творчество Адама Мицкевича в имагологическом восприятии в науке XXI столетия : сб. науч. работ / Гродн. гос. ун-т им. Янки Купалы ; Науч.-дидакт. координац. центр «Международный ин-т им. Адама Мицкевича» ; под науч. ред. С. Ф. Мусиенко ; редкол.: С. В. Гончар [и др.]. – Гродно : ЮрСаПринт, 2020. – 254 с.
7. *Хмяльніцкі, М. М.* Дыялог культур і традыцый: беларускі дыскурс у польскай літаратуры 1918–1939 гг. / М. М. Хмяльніцкі. – Мінск : БДУ, 2021. – 208 с.
8. Хоревские чтения. Память культуры: Гродно в жизни и творчестве Зофьи Налковской : сб. науч. работ : в 2 т. / Гродн. гос. ун-т им. Янки Купалы ; отв. ред. С. Ф. Мусиенко ; редкол.: И. В. Жук [и др.]. – Гродно : ЮрСаПринт, 2015. – Вып. 2. – Т. 1. – 292 с.
9. *Musijenko S.* Wiktora Aleksandrowicza Choriewa koncepcja imagologii / S. Musijenko // Studia bibliograficzne. – 2017. – № 3. – S. 11–43.
10. *Musijenko S.* “Wesele” Stanisława Wyspiańskiego w ujęciu imagologicznym (spojrzenie z Białorusi) / S. Musijenko // Bibliotheca Mundi. Studia bibliologiczne ofiarowane Janowi Leończukowi. – Białystok : Uniwersytet w Białymstoku, 2016. – S. 779–789.
11. *Хорев, В. А.* Об истоках и развитии этнических стереотипов (на материале польско-русских литературных отношений) / В. А. Хорев // Польская мова і літаратура ў кантэксце славянскіх культур / рэд. С. Мусіенка. – Гродна : ГрДУ, 1995. – С. 68–81.
12. *Хорев, В.* Имагология и изучение русско-польских литературных связей / В. Хорев // Поляки и русские в глазах друг друга / отв. ред. В. А. Хорев. – М. : Индрик, 2000. – С. 22–32.
13. *Хорев, В. А.* Польша и поляки глазами русских литераторов : имагологические очерки / В. А. Хорев. – М. : Индрик, 2005. – 231 с.
14. *Хорев, В. А.* Белорусские мотивы в творчестве Тадеуша Конвицкого / В. А. Хорев // Белорусско-российский диалог (культура и литература Беларуси XX–XXI вв.) / Рос. акад. Наук ; Ин-т славяноведения ; Нац. акад. наук Беларуси ; Ин-т литературы им. Я. Купалы. – М. : Институт славяноведения РАН, 2006. – С. 136–144.
15. *Хорев, В. А.* Имагологический аспект культурной памяти / В. А. Хорев // День и вся жизнь : сб. науч. работ ; под ред. С. Ф. Мусиенко. – Гродно : ЮрСаПринт, 2013. – С. 22–31.
16. *Мусіенка, С.* Беларускі стэрэатып паляка як прадмет гісторыка-імагалагічнага вывучэння / С. Мусіенка // Исторические и психолого-педагогические науки : сб. науч. статей. – Минск : РИВШ, 2016. – С. 177–184.
17. *Мусіенка, С.* “Калі я думаю пра Гродна…” (Гродзенскія матывы ў творчасці Зоф’і Налкоўскай) / С. Мусіенка // Краю мой – Нёман. Гродзеншчына літаратурная. Паэзія, проза, крытычныя артыкулы / уклад. Д. Бічэль-Загнетава, А. Цяжкі ; рэдкал.: Ю. Голуб [і інш.]. – Мінск : Мастацкая літаратура,

1986. – С. 211–231.
18. *Мусіенка, С. П.* Беларуска-польскія літаратурныя ўзаемасувязі / С. П. Мусіенка // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. – Мінск : Беларуская савецкая энцыклапедыя, 1984–1987. – Т. 4. – 1987. – С. 346–350.
19. *Мусиенко, С. Ф.* Творчество Зофьи Налковской / С. Ф. Мусиенко. – Минск : Наука и техника, 1989. – 205 с.
20. *Мусиенко, С. Ф.* Гродненские мотивы в творчестве Зофьи Налковской / С. Ф. Мусиенко // Зофье Налковской посвящается… : материалы науч. конф., Гродно, 16–18 мая 1989 г. / под общ. ред. С. Ф. Мусиенко, С. А. Габрусевича. – Минск : Полымя, 1991. – С. 32–41.
21. *Мусиенко, С. Ф.* Реалистический роман в польской литературе межвоенного двадцатилетия (20–30-е гг. XX в.) : монография / С. Ф. Мусиенко. – Гродно : ГрГУ, 2003. – 262 с.
22. *Мусіенка, С.* Гродна ў дзённіку і творчасці Зоф'і Налкоўскай / С. Мусіенка // Творчасць Зоф'і Налкоўскай і славянскія літаратуры : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Гродна, 17–18 мая 2004 г. / ГрДУ імя Я. Купалы. – Гродна : ГрДУ, 2005. – С. 32–40.
23. *Мусіенка, С.* Генрых Сянкевіч на Беларусі / С. Мусіенка // Powieść historyczna dawniej i dziś. – Kraków : Wydawnictwo Naukowe AP, 2007. – S. 334–343.
24. *Мусиенко, С.* Роман Зофьи Налковской «Недобрая любовь» – гродненские реалии / С. Мусиенко // Pogranicza. Kresy. Wschód a idee Europy. Wiktor Choriew in memorium. – Białystok : Uniwersytet w Białymstoku, 2013. – S. 723–734.
25. *Мусиенко, С. Ф.* Жанрово-стилевые искания в польской прозе конца 50-х – середины 60-х гг. XX века : монография / С. Ф. Мусиенко ; Гродн. гос. ун-т им. Янки Купалы, Науч.-дидакт. координац. центр «Международный ин-т им. Адама Мицкевича», каф. иностр. яз. – Гродно : ЮрСаПринт, 2015. – 200 с.
26. *Мусиенко, С.* Польская литература в имагологической интерпретации В. А. Хорева / С. Мусиенко // Балтийский филологический курьер. – 2013. – № 9. – С. 99–113.
27. *Мусиенко, С.* Имагология в белорусском литературоведении (программа и некоторые размышления автора-составителя) / С. Мусиенко // Лингвистика и методика в высшей школе : сб. науч. ст. / Гродн. гос. ун-т им. Янки Купалы ; отв. ред. В. С. Истомин. – Гродно : ЮрСаПринт, 2014. – Вып. 6. – С. 177–184.
28. *Мусиенко, С. Ф.* Гродно в имагологическом пространстве трудов В. А. Хорева / С. Ф. Мусиенко // Літаратурныя сувязі: праблемы імагалогіі : Хораўскія чытанні / рэдкал.: С. П. Мусіенка [і інш.]. – Мінск : РІВШ, 2016. – С. 7–11.
29. *Мусіенка, С. П.* Гродна ў жыцці і творчасці Элізы Ажэшка і Зоф'і Налкоўскай / Мусіенка С. П. // Роднае слова. – № 8. – 2009. – С. 20–25.

30. *Мусиенко, С. Ф.* Проблема кресов в польском и белорусском социально-бытовом романе (Э. Ожешко, З. Налковской, А. Карпюка) / С. Ф. Мусиенко // Публічная бібліятэка ў кантэксце сацыякультурнай прасторы рэгіёна: два стагоддзі гісторыі : матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф., Гродна, 16–17 верас. 2010 г. ; да 180-годдзя з дня заснавання ДУК "Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я. Ф. Карскага" : матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф., Гродна, 2–3 чэрв. 2011 г. ; да 170-годдзя з дня нараджэння Э. Ажэшкі / [да зборніка ў цэлым: склад. Л. В. Мальцава, М. Э. Ігнатовіч]. – Гродна : Гродзенская друкарня, 2013. – С. 97–110.
31. *Мусиенко, С. Ф.* Адам Мицкевич – Александр Пушкин: схожесть и различие (имагологический аспект) / С. Ф. Мусиенко // Творчество Адама Мицкевича в имагологическом восприятии в науке XXI столетия : сб. науч. работ / Гродн. гос. ун-т им. Янки Купалы, Науч.-дидакт. координац. центр «Международный ин-т им. Адама Мицкевича» ; под ред. С. Ф. Мусиенко ; редкол.: С. В. Гончар [и др.]. – Гродно : ЮрСаПринт, 2020. – С. 71–94.
32. Творчасць Элізы Ажэшкі і беларуская культура : зб. навук. прац / Гродз. дзярж. ун-т імя Янкі Купалы ; каф. польск. філал. ; пад рэд. С. П. Мусіенкі. – Гродна : ГрДУ, 2002. – 332 с.
33. Творчество Элизы Ожешко в эстетическом пространстве современности : сб. науч. ст. / Гродн. гос. ун-т им. Янки Купалы ; под ред. С. Ф. Мусиенко ; редкол.: С. Ф. Мусиенко [и др.]. – Гродно : ГрГУ, 2011. – 383 с.
34. *Мусиенко, С. Ф.* Спецкурс «Памятники культуры Гродно в творчестве Зофьи Налковской» / С. Ф. Мусиенко // Актуальныя праблемы паланістыкі-2009 : зб. навук. арт. – Мінск : Права і эканоміка, 2009. – С. 229–240.

*Поступила в редакцию 14.07.2023*